УДК 72.025

# Рэканструкцыя брамы, дзвярэй і вокнаў будынкаў замку ў Копылі на падставе інвентара Княства Капыльскага 1693 г.

Шэстак Ю. Т., Аўгусціновіч Е. А., Сутурын А. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Інвентар Княства Капыльскага 1693 г. утрымлівае апісанне ўсіх пабудоваў, якія адносіліся да невялікага драўлянага маёнтка князёў Радзівілаў, які размяшчаўся на Замкавай гары ў г. Копыль (тады цэнтр аднайменнага княства). Згодна гэтаму гістарычнаму дакументу ў склад сядзібы ўваходзілі чатыры будынкі: жылы дом, прызначаны для часовага перабывання гаспадароў, стайня з вазоўняй, піўніца, а таксама кухонны дом. У 2017 г. у ходзе правядзення архітэктурнага праектавання на архітэктурным факультэце БНТУ пры распрацоўцы візуальнай часткі канцэпцыі фарміравання культурна-асветніцкага комплекса "Замкавая Гара" ў г. Копыль Мінскай вобласці аўтары выканалі графічную рэканструкцыю сядзібнага комплекса на падставе інвентарных дадзеных і іншых гістарычных крыніцаў. Для дасягнення пастаўленай мэты спатрэбілася аднавіць вонкавы выгляд усіх архітэктурных кампанентаў (планіроўка, канструкцыя, дэкаратыўныя элементы і г.д.).

На ўездзе ў сядзібу з боку горада ў інвентары апісваецца брама з сасновых тарцінаў, абабітых акоўкай з жалезнымі цвікамі. Злева ад брамы знаходзіўся жылы дом з уваходнымі сасновымі дзвярамі з клямкай і антабай. Усе ўнутраныя дзверы дома, а таксама дзверы ў піўніцу і дзверы ў кухонны будынак былі зроблены з сасны, у той час, як напрыклад уся мэбля – з ліпы. У вазоўню вялі збітыя жалезнымі цвікамі падвойныя вароты. Унутраныя транзітныя дзверы абсталёўваліся зашчэпкамі, а ў спальню і камору – яшчэ і замком. Усе дзверы мацаваліся на завесах. Вокны ўва ўсіх пабудовах былі пералічаны асобна для кожнага пакоя. Усе вокны зробленыя з волава, з жалезнымі прутамі, мацуюцца на малых завесах ("завесках") з нарожнікамі, зачыняюцца на кручкі.

У апісанні былі дакладна пазначана колькасць элементаў, што вельмі спрашчала задачу аднаўлення вонкавага выгляду. Апрача інвентара 1693 г., які выступаў галоўнай крыніцай інфармацыі, для пошуку вобразных аналагаў былі выкарыстаны айчынныя і замежныя ўзоры аб'ектаў драўлянага і мураванага дойлідства разглядаемага гістарычнага перыяду, у прыватнасці дзвярныя і ваконныя запаўненні, а таксама прыклады скабяных вырабаў, якія захаваліся на фотадакументах і ў натурным выглядзе ў сядзібах Радзівілаў у Нясвіжы, Альцы і інш. Дадзены прыём быў выкарыстаны з мэтай атрымання максімальна набліжанай да рэальнасці канструктыўнай і архітэктурна-мастацкай рэканструкцыі.